# І этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” (2018/2019 навучальны год)

## Комплексная работа

## Даведкі

<table>
<tr><th>№</th><th>ІХ клас</th><th>Х клас</th><th>ХІ клас</th></tr>
<tr><td>1</td><td colspan="3">Максімальная колькасць балаў – 2,5.<br>За кожны правільны адказ – па 0,5 бала.
<table>
<tr><td>Асіміляцыя па глухасці</td><td>Асіміляцыя па звонкасці</td><td>Асіміляцыя па мяккасці</td><td>Асіміляцыя свісцячых да шыпячых</td><td>Асіміляцыя шыпячых да свісцячых</td></tr>
<tr><td>адказ, перабежчык і пад.</td><td>носьбіт малацьба і пад.</td><td>дзверы, звечарэла і пад.</td><td>сшыць, езджу і пад.</td><td>на дарожцы, збіраешся і пад.</td></tr>
</table></td></tr>
<tr><td>2</td><td colspan="3">Максімальная колькасць балаў – 4,5.<br>За кожны правільны адказ у частцы А – 0,5 бала (максімальная колькасць балаў за частку А – 1,5 бала).<br>За кожны правільна ўстаўлены лічэбнік у частцы Б – 0,5 бала (у фразеалагізме ‘адным стрэлам забіць двух зайцаў’ 0,5 балаў залічваецца за абодва ўстаўленыя словы, але дапускаецца частковае залічэнне 0,3 бала за адзін правільны адказ), тлумачэнне фразеалагізма – 1 бал (максімальная колькасць балаў за частку Б – 3).</td></tr>
<tr><td></td><td>А. Абрэвіятура – скарачэнне, дыскусія – спрэчка, фрагмент – урывак.<br>Б. Іграць першую скрыпку – займаць галоўнае становішча ў чым-небудзь; за сямю пячаткамі – быць недаступным, прыхаваным.</td><td>А. Антракт – перапынак, інтэрв’ю – гутарка, ілюстрацыя – малюнак.<br>Б. Да сёмага (дзясятага) поту – да поўнай знямогі, стомы (рабіць, працаваць); палка з двума канцамі – тое, што можа скончыцца добра і дрэнна.</td><td>А. Аргумент – доказ, інцыдэнт – выпадак, кампетэнтнасць – дасведчанасць.<br>Б. Адным стрэлам забіць двух зайцаў – выканаць адначасова дзве розныя справы, дасягнуць дзвюх розных мэт; у чатырох сценах (сядзець, жыць) – не маючы ні з кім зносін, у адзіноце.</td></tr>
<tr><td>3</td><td colspan="3">Максімальная колькасць балаў – 4,5.<br>За кожнае правільна выпісанае слова – 0,5 бала, правільна вызначаную ўтваральную аснову – 0,5 бала, правільна вызначаны спосаб утварэння – 0,5 бала.</td></tr>
<tr><td></td><td>Вечназялёніцца – вечназялён(ы) (суфіксальна-постфіксальны);<br>ахапісты – ахапі(ць)</td><td>Азёрнавокі - азёрн(ы) +вок(а) (складана-суфіксальны),<br>запрыгоршчыць - прыгаршч(ы)</td><td>Кветкарунны - кветк(а) + рунь (□) (складана-суфіксальны);<br>тэлемаланка –тэлевізійн(ая) + маланк(а)</td></tr>
</table>

| № | IX клас | X клас | XI клас |
|---|---|---|---|
| | (суфіксальны);<br>звышнябёсы – нябёс(ы) (прыставачны) | (прыставачна-суфіксальны),<br>вырайніца - вырай(□) (суфіксальны) | (складанаскарочаны);<br>нявесціцца – нявест(а) (суфіксальна-постфіксальны) |
| **4** | *Максімальная колькасць балаў – 3.*<br>*За кожны правільна запоўнены радок – 0,3 бала: правільна адноўленае правіла – 0,1 бала, правільна запісанае спалучэнне – 0,2 бала.* | | |
| | 1 - з вялікай літары: Алесіны кнігі,<br>2 - з вялікай літары: Паўночная Італія,<br>3 - з малой літары: сізіфава праца,<br>4 - з вялікай літары: Дзень настаўніка,<br>5 - з малой літары: суботнік. | 1 - з вялікай літары: Коласавы творы,<br>2 - з вялікай літары: Заходняя Еўропа,<br>3 - з малой літары: саламонава рашэнне,<br>4 - з вялікай літары: Дзень маці,<br>5 - з малой літары: дзень адчыненых дзвярэй. | 1 - з вялікай літары: Насовічаў слоўнік,<br>2 - з вялікай літары: Вялікае Герцагства Люксембург,<br>3 - з малой літары: пірава перамога,<br>4 - з вялікай літары: Дзень славянскай пісьменнасці,<br>5 - з малой літары: дзень сустрэчы выпускнікоў. |
| **5** | *Максімальная колькасць балаў – 2,5.*<br>*За кожнае правільна перакладзенае словазлучэнне – 0,5 бала.* | | |
| | Высокая жырафа, чорны лебедзь, жаночы туфлік, доўгі цень, службовы сабака. | Пажоўклая таполя, цікавая фраў, новы кед, зялёнае ківі, азіяцкі поні. | Таленавіты імпрэсарыа, шэрая гусь, свежая кальрабі, старажытны рукапіс, металічнае клішэ. |
| **6** | *Максімальная колькасць балаў – 4.*<br>*За кожнае правільна перакладзенае словазлучэнне – 0,8 бала.*<br>*Звяртаем увагу, што за недакладны паслоўны пераклад цэлага словазлучэння (напрыклад, ‘раз у тыдзень’ замест ‘раз на тыдзень’) дазваляецца залічыць не больш за 0,4 бала.*<br>*Асобны павільны пераклад слоў з ліку самастойных часцін мовы можа быць ацэнены ў 0,1 бала за кожнае слова.* | | |
| | Поехать к сестре – паехаць да сястры;<br>болеть гриппом – хварэць на грып;<br>охотиться за волком – паляваць на ваўка;<br>охранять по ночам – вартаваць па начах;<br>раз в неделю – раз на тыдзень. | Приехать через месяц – прыехаць праз месяц;<br>на этих днях – гэтымі днямі;<br>дышать полной грудью – дыхаць на поўныя грудзі;<br>жениться на Алле – ажаніцца з Алай;<br>минуты три – хвіліны са тры. | Послать письмо по адресу – паслаць ліст на адрас;<br>в другой раз – іншым разам;<br>благодарю вас – дзякую вам;<br>в трёх километрах от города – за тры кіламетры ад горада;<br>уход за больным – догляд хворага . |
| **7** | *Максімальная колькасць балаў – 5,5.*<br>*За правільна афармлены тэкст – 5 балаў. Звяртаем увагу, што за кожную дапушчаную памылку неабходна адымаць 0,2 бала ад агульнай колькасці балаў за заданне (г.зн. ад 5 балаў).*<br>*За правільны адказ на пытанне культуралагічнага характару – 0,5 бала.* | | |

| № | IX клас | X клас | XI клас |
|---|---|---|---|
| | Ніводная з тутэйшых жанчын у дні, што аддзялялі Божае нараджэнне ад свята Трох Каралёў, нізашто на свеце ні разу не пакруціла б верацяном, бо тады вясной усялякая хатняя птушка пазводзілася б ад завароту галавы. Ніводная ў дзень Паднясення Святога Крыжа не хадзіла ў лес у грыбы і ягады, бо тады навяла б усіх лясных гадаў на сваю хату. Ніводная, жнучы, не ўпускала з пільнай увагі, каб выпадкова не зрэзаць сярпом звязаных ці заламаных каласоў, бо звязвае іх так альбо заломвае незычлівая рука на няшчасце той, якая іх сажне. І шмат падобных прыкмет і звестак ад дзядоў, прадзедаў мелі насельнікі Сухой Даліны.<br><br>Згодна з хрысціянскімі запаведзямі, забараняецца працаваць у нядзелю, у дні, калі адзначаюцца рэлігійныя святы. | Непадалёк пачулася песня. Неўзабаве танклявыя дзіцячыя галасы пішчалі ўжо каля яго вокан:<br>На новае лета<br>Няхай родзіцца жыта!..<br>Святы вечар!<br>Пажадаўшы Міканораваму бацьку, каб радзіла не толькі жыта, але і пшаніца, галасы пад вокнамі, на момант перапыніўшы спеў, аб нечым паспрачаўшыся, нядружна запішчалі:<br>Квас варыць,<br>Міканора жаніць!..<br>Святы вечар!<br>Бацька на гэтае пажаданне ахвотна засмяяўся, весела зірнуўшы на Міканора. Маці, усцешаная, прытулілася тварам да незамерзлага ражочка акна, углядаючыся ў твары спевакоў. Расчуленая жанчына, не апранаючыся, вынесла раннім спевакам добры кавалак каўбасы і акраец свежага хлеба.<br>Ва ўрыўку апісваецца абрад калядавання (шчадравання). | Наведалі палац сяляне з казою. З тварамі, намазанымі сажай, у вывернутых кажухах, яны прынеслі з сабой мароз, гукі дуды, цымбал і бубна. Каза была ў шэрым ваўчыным футры і ў сушанай авечай масцы з пукам каласоў замест барады. Каза спявала дураслівым голасам. Гэта была ўжо не забава, а важная справа. Тым, каму пашанцавала ўбачыць “душу” нівы, вядома, што яна падобная да спрытнай казы, якая бегае на задніх ножках. Спачатку ёй добра жыць, але потым жнуць паспеўшае жыта – і ўсё менш застаецца зарослага месца, дзе магла б схавацца спалоханая душа нівы. У адчаі яна хаваецца ў апошнюю жменю нязжатых каласоў – гэта і ёсць барада казла. Апошнюю жменю зразаюць асцярожна. Яна ляжыць пад абразамі і выходзіць з хаты толькі на свята, прывязаная да галавы казы.<br>У тэксце ідзе гаворка пра Каляды (каза як сімвал урадлівасці з’яўляецца традыцыйным персанажам калядных свят). |
| **8** | *Максімальная колькасць балаў – 2,5.*<br>*За кожны правільна адзначаны (або неазначаны) адказ – 0,5 бала.* | | |
| | 1, 4 | 2, 3 | 3, 5 |
| **9** | *Максімальная колькасць балаў – 6.*<br>*За кожны правільны адказ – 0,3 бала (за кожную з 20-і пазіцый).* | | |
| | Якуб Колас - 1, 8, 9, 11, 15, 16;<br>Янка Купала – 2, 5, 7, 8, 10, 12; | Уладзімір Караткевіч – 1, 4, 7, 10, 12, 16, 17;<br>Васіль Быкаў – 3, 6, 9, 11, 13, 15; | Рыгор Барадулін – 2, 4, 5, 6, 7, 10, 12, 16;<br>Іван Мележ – 3, 8, 9, 11, 13;<br>Алесь Разанаў – 1, 14, 15, |

| № | IX клас | X клас | XI клас |
|---|---|---|---|
| | Максім Багдановіч – 3, 4, 6, 13, 14. | Аляксей Дудараў – 2, 5, 8, 14. | 17. |
| 10 | *Максімальная колькасць балаў – 15.* | | |

| | |
|---|---|
| 1. Тэма – услаўленне вобраза беларускай жанчыны-маці. | *1 бал* |
| 2. Ідэя – разуменне лірычным героем сваёй няўдзячнасці да маці. | *1 бал* |
| 3. Паэт устаўляе матчыны вочы, рукі, сэрца з дапамогай рытарычнага зварота. | *1 бал (0,5 бала – адказ на першую частку пытання, 0,5 бала – назва стылістычнай фігуры)* |
| 4. Твор можна падзяліць на тры часткі: першая частка складаецца з двух строф, другая частка – тры страфы, трэцяя частка – апошняя страфа. | *1,5 бала (0,3 бала за кожны адказ)* |
| 5. Двухстопны анапест | *1 бал (0,5 бала – памер, 0,5 бала – колькасць стоп)* |
| 6. Індывідуальна-аўтарскае словазлучэнне. Узыходзіць – весці свой пачатак, паходжанне ад чаго-небудзь. Менавіта такім пачаткам з’яўляецца для лірычнага героя родны дом. | *2 бала (1 бал – від словазлучэння; 1 бал – тлумачэнне слова)* |
| 7. Вочы ззялі зоркамі, усміхаліся, забаўлялі | *1 балы (0,5 бала – прыклад; 1 – 2-3 прыклады)* |
| 8. “Сорам наш / Ты насіла вялізарным горам”; “Кропля ж кожная / Радасці светлай дзіцячай … / Разлівалася морам...” | *1 бал (0,5 бала – прыклад)* |
| 9. Вясёлымі зоркамі, мілыя рукі, сном галубіным | *1 бал (0,5 бала – прыклад)* |
| 10. Інверсія, з дапамогай якой сэнсава выдзяляюцца найбольш важныя словы. | *1,5 бала (0,5 бала – тэрмін, 1 бал – тлумачэнне)* |
| 11. “Жаль, і горыч, і боль / Мне душу працінае…” Падкрэслівае адчай лірычнага ад немагчымасці выправіць свае памылкі. | *2 балы (1 бал – прыклад градацыі, 1 бал – тлумачэнне)* |
| 12. Аўтар нібы канстатуе няўдзячнасць кожнага з чытачоў у адносінах да сваіх маці. | *1 бал* |

*Максімальная колькасць балаў – 50.*
*За кожную дапушчаную памылку ў адказе неабходна здымаць 0,2 бала ад агульнай колькасці балаў за заданне.*